***Лічэбнік** (6 клас)*

*1.Адзначце лічэбнікі:* а) двойка; б) мільён; в) шосты; г) шмат; д) тры дзясятыя.

*2.Вызначце від лічэбнікаў паводле складу:* а) семдзесят___________; б) адзінаццаць ____________________; в) шэсцьдзесят ___________________; г) чатыры пятыя ______________; д) сем ______________

*3.Адзначце лічэбнікі, у якіх на канцы пішацца мяккі знак:* а) 30; б) 9; в) 16; г) 8; д) 600.

*4.Адзначце склонавыя формы лічэбнікаў, запісаныя памылкова:* а) Н.дзевяцьсот; б) Р.дзевяцісот; в) Д.дзевяцістам; г) В.дзевяцісот; д) Т.дзевяцюстамі; е) М.(аб) дзевяцюстах.

*5.Адзначце спалучэнні, у якіх правільна дапасаваны лічэбнікі да назоўнікаў:* а) трое качанят; б) іх прыехала шасцёра; в) пяцёра дзвярэй; г) дзявяцера дзяўчынак; д) сем свіней.

*6.Адзначце правільна напісаныя парадкавыя лічэбнікі:* а) пятнаццаты; б) васьмідзясяты; в) шасцісоты; г) чацьвёрты; д) дзявяносты.

*7.Адзначце склонавыя формы, у якіх назоўнік пры лічэбніку ўжыты памылкова:* а) Н.паўтары секунды; б) Р.паўтары секундаў; в) Д.паўтары секундам; г) В.паўтары секунды; д) Т.паўтары секундам; е) М.(аб) паўтары секундах.

*8.Адзначце лічэбнікі, якія ў форме творнага склону запісаны правільна:* а) шасццю; б) дзевяццю; в) чатырнаццаццю; г) дваццацю; д) сямнаццаццю.

*9.Адзначце склонавыя формы лічэбніка, запісаныя памылкова:* а) Н.сто; б) Р.ста; в) Д.ста; г) В.сто; д) Т.сто; М.(аб) сто.

*10.Адзначце лічэбнікі, якія маюць форму роду:* а) тысяча; б) сем пятых; в) два; г) абедзве; д) дзевяцьсот восемдзесят тры.

*11.Адзначце лічэбнікі з націскам на першым складзе:* а) дваццаты; б) семярых; в) васьмярымі; г) трыста; д) шэсцьдзесят.

*12.Адзначце дробавыя лічэбнікі:* а) сямёра; б) восем пятых; в) паўтары; г) адзінаццаць цэлых і дзве сёмыя; д) чатыры і шэсць дзясятых.

*13.Адзначце парадкавыя лічэбнікі:* а) пяцітысячны; б) дзявяцера; в) трэці; г) шэсць чацвёртых; д) васьмідзясяты.

*14.Адзначце лічэбнікі, у якіх змяняецца толькі апошняя частка:* а) чатыры трынаццатыя; б) семсот тры; в) тысяча шэсцьсот семдзесят восьмы; г) пяцьсот пяцьдзясят сёмы; д) трохсоттысячны.

*15.Адзначце зборныя лічэбнікі:* а) семдзесят; б) абодва; в) пяцьдзясят сёмы; г) дзевяцьсот; д) сямёра.

*16.Адзначце лічэбнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца* ***ь:*** а) шэсц_дзесят; б) сем_сот; в) вас_мюстамі; г) васям_наццаць; д) восем_дзесят.

*17.Адзначце лічэбнікі, якія пішуцца ў два словы:* а) 504; б) 2001; в) 346; г) 711; д) 1000000.

*18.Адзначце лічэбнікі, якія пішуцца разам:* а) (сем)сот; б) (пяць)дзясят; в) (двух)мільённы; г) (пяць)тысяч; д) (чатырох)соты.

*19.Які колькасны лічэбнік змяняецца па родах, ліках і склонах:* а) адзін; б) два; в) пяць; г) сем; д) восем.

*20.Якія лічэбнікі змяняюцца як назоўнікі і маюць род і лік:* а) нуль; б) тры; в) тысяча; г) мільён; д) мільярд.

*21.Якія лічэбнікі ў творным склоне маюць на канцы* ***–ма:*** а) адзін; б) два; в) тры; г) сем; д) дзевяць.

*22.Які лічэбнік змяняецца як назоўнік першага скланення:* а) сем; б) паўтары; в) дванаццаць; г) тысяча; д) мільярд.

*23.Адзначце назоўнікі, якія могуць спалучацца са зборнымі лічэбнікамі* ***двое, трое*** *і інш.:* а) каваль; б) кураня; в) ясень; г) гусь; д) талерка.

*24.Адзначце сказы, у якіх словазлучэнні з лічэбнікам выступаюць у ролі выказнікаў:* а) Хутка на двор уз’ехала трое саней; б) У вучобе Слава самы першы; в) Самы складаны для студэнта – першы курс; г) Наша хата дзясятая ад школы; д) Рост у хлопца – сто восемдзесят сантыметраў.